**Галаскокаў, В.** У памяці — Афганістан / В. Галаскокаў // Патрыёт (Ушачы). — 1993. — 12 лют. — С. 2.

## У ПАМЯЦІ – АФГАНІСТАН

Прайшло чатыры гады, як нашы салдаты пакінулі афганскую зямлю, пакідаючы ў сваёй памяці цяжкія ўспаміны аб той неаб'яўленай вайне, ад якой засталіся горыч і крыўда за памылку, за якую давялося расплачвацца крывёю нашых хлопцаў. Хлопцаў – чые лёсы паспелі паспытаць ліха вайны. Як бы ні было, усё ж два гады, хто іх правёў у Афганістане, былі самымі цяжкімі ў жыцці. Дзень памяці – 15 лютага – дзень памяці тых, хто не вярнуўся дамоў да маці і сваіх нявест, да родных мясцін, дзе так было ўсё знаёма і блізка. А для тых, хто вярнуўся ўсё роўна ў душы і на сэрцы рана, бо на вайне людзі становяцца мудрэйшымі і ведаюць кошт жыцця.

Не забываюцца кашмарныя сны, у якіх нас праследуюць барадатыя душманы, ды гарачае спякотнае сонца і пыл афганскай зямлі. Кожны дзень – дарогі, зялёнка і пастаянна небяспека побач. Думаецца, як толькі вытрымлівала тэхніка ўсё гэта. Бывала прыйдзеш з аперацыі, памыешся ў лазні і зноў трэба запраўляць яе, загружацца і ў шлях па гарах і пустынях, з Захаду на Усход, з Поўначы на Поўдзень. Пастаянна ў руках зброя. Ствол так адпаліраваны рукамі, што блішчыць як нікеліраваны. Карманы адцягвае зброя і боепрыпасы, але ж без іх нельга.

Абавязкова пасля аперацыі кагосьці не далічышся – або на міне сябар падарваўся, або загінуў ад стрэлу душманаў. Бывалі пад час гэтай вайны і невялікія радасці. Гэта, калі з аперацыі прыйдзеш, а сябры ўжо натапілі лазню, падрыхтавалі гарачую вячэру. І тады змыўшы бруд неяк забывалася ўся тая небяспека, якая кожную хвіліну вітала над галавой ад душманскіх абстрэлаў. І тады, як кажуць, нібы той «белы чалавек» выспішся ўдосталь. Чаго яшчэ трэба, калі ёсць вада, мяккі ложак, халодны квас і ёсць магчымасць паглядзець тэлевізар...

А з раніцы зноў рыхтуешся на аперацыю – і ўсё спачатку. Такая нялёгкая праца салдата.

А гады ідуць. Сустракаеш сваіх баявых сяброў і так прыемна на іх глядзець, паколькі гэта нашы – праверaныя на справе, якія не падводзілі і не падвядуць. З такімі хоць куды. Лёс раскідаў па розных кутках нашай краіны ветэранаў афганскай вайны, але ўсё такі ў памяці засталіся падзеі мінулых дзён і скупыя радкі пісьмаў ад свайго баявога сябра. Яшчэ не раз зберымся за сталом, каб успомніць і не забыцца пра гэты дзень – дзень памяці, 15 лютага.

**В. Галаскокаў**,
былы воін-інтэрнацыяналіст